**Грышановіч Алена Сяргееўна,** настаўнік пачатковых классаў ДУА "Сярэдняя школа №1 ім. Б.М. Дзмітрыева г. Асіповічы"

**Прадмет**: беларуская літаратура.

**Класс:** 3

**Тэма ўрока**: І. Шамякін "Пастух".

**Тып ўрока**: урок засваення новых ведаў.

**Задачы:** пазнаёміць вучняў з творам І. Шамякіна "Пастух"; вучыць вызначаць у прачытаным творы персанажаў, іх рысы характару і тлумачыць учынкі дзеючых асоб; вучыць вызначаць галоўную думку твора; падрабязна пераказваць змест часткі апавядальнага тэксту па апорных словах; садзейнічаць выхаванню павагі да старэйшых, да працы.

**Формы работы**: індывідуальная, парная, групавая, франтальная.

**Абсталяванне**: Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне: вучэб.дапам. для 3 класа ўстаной агул.сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М.В. Жуковіч. – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2017, дэманстрацыйны матэрыял, карткі з заданнямі для груп, для дамашняга задання, слоўнік рысаў характару.

## Ход ўрока

### I. Арганізацыйны этап

Прагучаў званок вясёлы,

Запрасіў нас на ўрок.

Хорам:

Будем добра працаваць,

Новы твор вывучаць.

А чытанне будзе гучным,

Правільным і мілагучным.

### II. Падрыхтоўка да работы на асноўным этапе

**2.1** Адгадайце загадку.

Хто пасвіць кароў і коз,

Там, дзе луг травой зарос? (Пастух)

**2.2** Моўная хвілінка.

Спявае **ражок,** спявае **ражок**!

Мы гонім **статак** на лужок.

Пасем **кароў** мы цэлы дзень,

Толькі стане **горача-**гонім у цень.

Прачытайце верш. Прачытайце, выдзяляючы словы голасам. Прачытайце, перадаючы голасам вясёлы настрой, сумны настрой. Чаму гэты верш можна прачытаць і з сумам? (Трэба вельмі рана прачынацца, каб пасвіць кароў.)

**2.3** Паведамленне тэмы і задач урока.

Сёння на уроку пазнаемімся з творам Івана Шамякіна "Пастух".

Якія задачы стаяць перад вамі? Вызначце іх, выкарыстоўваючы апорныя словы: героі, рысы характару, учынкі, пераказ урыўка па апорных словах.

Вучні называюць задачы ўрока: мы будзем умець вызначаць галоўных герояў твора, іх рысы характару, тлумачыць іх учынкі. Мы зможам пераказаць урывак твора па апорных словах.

**2.4** Знаемства з біяграфіяй Івана Шамякіна.

Расказвае добра падрыхтаваны вучань.

Іван Пятровіч Шамякін — народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, нарадзіўся 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Бацька стаў працаваць лесніком. У сувязі з гэтым месца жыхарства часта мянялася. Вучыўся пісьменнік у розных школах. Жыццё ў лесічоўках вельмі рана прывучвала да самастойнасці, да працы, да захаплення роднай прыродай. Твор "Пастух"- гэта аўтабіяграфічны твор.

**III. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

Работа з тэкстам будуецца  па тэхналогіі крытычнага мыслення, выкарыстоўваецца прыём “Чытанне з прыпынкамі”.

**3.1 Стадыя  выкліку.**

Па назве тэкста і малюнку вызначце, пра што будзе гаварыцца ў творы? Дзе будуць адбывацца дзеянні? Хто героі твора?

**3.2 Слоўнікавая работа**

стАлы, патрАва, зЫкаць, рахмАны, кужЭльны, крАмны, зАбаўкі, пУга, папрУжка.

**Стадыя асэнсавання**

**3.3 Знаёмства з тэкстам**

**Першы прыпынак.** Настаўнік чытае ўрывак на с. 17-18. Пасля чытання задае пытанні.  Вучні адказваюць на пытанні з апорай на тэкст.

Ад чыёй асобы вядзецца апавяданне? Хто галоўныя героі? Колькі гадоў было хлопчыку? Кім працаваў яго бацька? Што сказаў бацька, калі сыну стала восем гадоў? Чаму бацька так сказаў?  Каля якой вескі жыла сям'я хлопчыка? З якога горада прыехаў дзядзька Трышка? Якія мары былі ў героя пра новы занятак? Як сын аднёсся да слоў бацькі? Як гэта яго характырызуе?

На дошцы з'яўляюцца запісы:

Бацька – сказаў працаваць

Маці- шкадавала сына

Сын – слухаўся, баяўся бацьку, паважаў

**Што будзе далей і чаму?**

**Другі прыпынак.** Добра чытаючыя вучні чытаюць урывак с. 18-19. Ці правільна мы вызначылі працяг твора?

З якім настроем хлопчык збіраўся на першы працоўны дзень? Ці змяніліся зімнія мары і фантазіі за першую раніцу? Чаму?

А чаму такая работа аказалася цяжкай? Якім трэба быць, каб працаваць пастухом? Прачытайце, як герой вярнуўся дамоў? Як аднесліся родныя да гэтага?

На дошцы з'яўляюцца новыя запісы.

Бацька – сказаў працаваць, **быў няўмольны**

Маці- шкадавала сына, **плакала, дапамагала**

Сын – слухаўся, баяўся бацьку, паважаў, **у хату не заходзіў, плакаў за хлявом**

**Што будзе далей і чаму?**

**<u>Трэцці прыпынак.</u>** Самастойнае чытанне ўрыўка на с.20.

Ці спраўдзіўся наш прагноз? Што змянілася ў рабоце за лета?

**Работа ў парах.**

Вучні задаюць пытанні па ўрыўку, выкарыстоўваючы словы- пытанні. Што…? Хто…? Дзе…? Калі…? Куды…? Як….?

Што будзе далей і чаму?

**<u>Чацвёрты прыпынак.</u>** Настаўнік чытае ўрывак на с. 20-21, які вучні будуць потым пераказваць.

Ці спраўдзіўся наш прагноз?

На дошцы з'яўляюцца новыя запісы:

Бацька – сказаў працаваць, быў няўмольны, **усім расказваў**

Маці- шкадавала сына, плакала, дапамагала, **спужалася, ледзьве не страціла прытомнасць**

Сын – слухаўся, баяўся бацьку, паважаў, у хату не заходзіў, плакаў за хлявом, **спужаўся**

Ці мог загінуць герой? Чаму так аднесліся бацькі? Бацька не любіў сына? Чаму?

**3.4 Фізкультхвілінка "Ці верыце вы, што…".**

(Адказ "так"- пляскаць у далоні, адказ "не" – маўчаць.)

Ці верыце вы, што

- да сямі гадоў хлопчыкаў і дзяўчынак раней ласкава называлі - "дзіця",

” немаўля”,”кувяка". (Так)

- хлопчыкаў выхоўвалі стражэй чым дзяўчынак. (Так)

-дзеці маглі да 14 гадоў не дапамагаць дарослым. (Не)

-у сямігадовым узросце хлопчыкі спасцігалі асновы сялянскай працы. (Так)

- з сямі гадоў хлопчыкі ўмела заляцаліся за скацінай, ездзілі верхам на конях, дапамагалі ў полі пры ўборцы ўраджаю. (Так)

-раней бацькі ў весцы не дазвалялі дзецям працаваць. (Не)

-з 5-6 гадоў сыноў навучалі кіраваць коньмі, седзячы верхам. (Так)

- з 8-9-вучылі запрагаць і кіраваць, седзячы і стоячы ў возе, пасвіць кароў.(Так)

-калі бацькі прывучваюць дзяцей да працы з дзяцінства, значыць яны дапамагаюць ім падрыхтавацца да дараслага жыцця. (Так)

**3.5 Стадыя рэфлексіі**

Ці правільна ў пачатку ўрока мы вызначылі змест, герояў твора, месца дзеяння?

Якая асноўная думка закладзена Іванам Шамякіным у гэтым апавяданні? Як вы адносіцеся да хлопчыка? Чаму?

**IV. Этап прымянення ведаў і спосабаў дзеянняў**

**4.1 Работа ў групах.**

1 група.

**Выберыце прыказкі, якія падыходзяць да апавядання Івана Шамякіна “Пастух”. Растлумачце свой выбар.**

Добрае карэнне – добрае і насенне.

Бацькоўскае слова дарэмна не гаворыцца.

Не навучаць бацькі, дык навучыць гора.

Дзіця, не ўпаўшы, не вырасце.

2 група.

**Расстаўце па парадку пункты плана да апавядання Івана Шамякіна “Пастух”.**

__Першы працоўны дзень.

__Выпадак на пашы.

__Добрае пастухоўства.

__Мары пра работу пастуха.

3 группа.

**Напішыце рысы характару бацькі.**

1_______ 2____________ 3 ________ 4 __________5 __________

4 группа.

**Напішыце рысы характару маці.**

1__________ 2________ 3 _________ 4 __________5 __________

5 группа.

**Напішыце рысы характару хлопчыка.**

1__________ 2_________ 3 ________ 4 __________5 __________

**Слоўнік рысаў характару**

**Станоўчыя рысы характару:** добры, станоўчы, прыстойны, мэтанакіраваны, роўны, надзейны, лагодны, зычлівы, чалавечны, душэўны, спагадлівы, добразычлівы, спакойны, паслухмяны, клапатлівы, уважлівы, дбайны, руплівы.

смелы, кемлівы, разумны, адчайны, адважны, геройскі.

вясёлы, радасны, шчаслівы, захоплены, бесклапотны, бестурботны, легкадумны, гуллівы, безжурботны, жыццярадасны, няўрымслівы, святочны.

**Адмоўныя рысы характару:** сумны, невясёлы, сур'ёзны, хмурны, заклапочаны, маркотны, задуменны, змрочны, нудны, пануры, пахмурны, нікчэмны, засмучаны.

злы, дрэнны, злосны, адмоўны, кепскі, несумленны, скупы, злапамятны, яхідны, помсны, бессардэчны, драпежны, варожы, шкодны, запальчывы, бурклівы, незадаволены, гнеўны, недабразычлівы.

страшны, жудасны, баязлівы, прагны, хітры.

**4.2 Прэзентацыя выкананых заданняў.**

**V. Этап падвядзення вынікаў занятка**

-Якія новыя адкрыцці вы зрабілі сёння на ўроку?

Настаўнік аналізуе работу вучняў, выстаўляе адзнакі.

**VI. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

**Пераказаць урывак твора па апорных словах.**

Ударыла рогам --- падняла на рог --- панесла--- матляўся --- палезла ў гушчар --- церла аб кусты --- папружка лопнула --- чмякнуўся --- цела падрана --- маці --- бацька.